**Лысак К.Ф.**

# НЕФАРМАЛЬНЫХ РУХ Ў БЕЛАРУСІ НАПРЫКАНЦЫ XX СТАГОДДЗЯ ЯК ЧЫННІК ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

Напрыканцы XX стагодзя ва многіх краінах свету адбыліся радыкальныя змены ў сферы грамадскага і палітычнага жыцця. Крызіс сацыялістычнай мадэлі дзяржавы прывёў ў шэрагу краін да пераходу да капіталістычнага ладу, і ў рэшце да адной з самых значных і ўплывовых геапалітычных падзей некалькіх апошніх дзесяцігодзеў – да развалу СССР. Па рознаму і з рознымі вынікамі праходзіў гэты працэс ў розных кутках вялікай шматнацыянальнай і шматкультурнай краіне. Важную ролю ў пераходзе да стану незалежнага існавання адыграла дзейнасць грамадзянскай супольнасці. Бо, як сцвярджаюць спецыялісты, нефармальныя суполкі спрыяюць пераадоленню стану “атамізацыі” грамадства, то бок стварэнню сувязяў, які былі парушаны пад-час таталітарнага ладу, паміж яго прадстаўнікамі, і, як вынік, паступовы пераход да дэмакратычнага ладу. Менавіта да такіх рэспублік былога СССР і належыць Беларусь. Адным з чыннікаў, які паўплываў на палітычнае рашэнняе аб абвяшчэнні незалежнасці, з’яўляўся непасрэдна грамадзянскі рух. Нягледзячы на тое, што за ўвесь час савецкага ладу ў Беларусі не назіралася шырокага і выразнага дысідэнцтвана накшталт расейскага, пэўнае кола па-антысавецкі настроенай інтэлегенцыі ў краіне існавала заўсёды, асабліва ў асяродку мастакоў. Адна з першых вядомых суполак мастакоў, удзельнікі якой шчыльна цікавіліся беларускай культурай, утварылася ў 60-ыя гады XX ст. Збіраліся ўдзельнікі ў майстэрні мастака, кніжнага графіка, аўтара шэрагу партрэтаў дзеячоў беларускай культуры, Яўгена Куліка. Суполка атрымала назву “На паддашку” і праіснавла да другой паловы 70-ых гадоў. Тут атрымалі першую пляцоўку для дзейнасці, а таксама сфарміравалі свае погляды вядомыя дзеячы наступнага нацыянальнага руху.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Але паўнавартасны маладзёвы нефармальны рух бярэ свой пачатак ў 1979 годзе, пачынаючы так званай "Беларускай спеўна-драматычнай майстроўні" ці проста "Майстроўні." Суполка была ўтворна студэнтамі філалагічнага факультэту Беларускага дзяржаўнага ўніверсытэту і Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Прымалі, таксама, ўдзел вучні Рэспубліканскай школы інтэрнату па музыцы і выяўленьчаму мастацтву, вучні мінскіх школаў, працоўная моладзь. У пачатку сваёй дзейнасці суполка налічвала дзесатак удзельнікаў, а ужо напрыканцы свайго існавання - больш за сто чалавек. Як галоўную мэту майстроўцы ставілі вывучэнні і папулярызацую народнай беларускай культуры. Сваё натхненне удзельнікі суполкі чэрпалі з традыцыйных абрадаў ды свят, песняў, якія былі яшчэ больш-меньш характэрны для беларускай вёсцы. Многія майстроўцы былі гарадскімі жыхарамі толькі ў другім, а ў некаторых выпадках і ў першым пакаленні, таму памяць аб мове і традыцыях яшчэ захоўвалася ў свядомасці маладых людзей. Тым не менш, тагачасныя гарадскія ўмовы не спрыялі трываламу захаванню беларускай культуры ў бытавой сферы. За гады культурнай ўніфікацыі сталіца БССР стала, магчыма, самых дэнацыялізаваным горадам у краіне. Такім, чынам выкарыстане ў штодзённасці беларускай мовы, відавочная прыхільнасць да народных традыцый, выклікала супрацьдзеянне, у першую чаргу, з боку соцыуму. Але слушны выбар кірункаў і форм дзейнасці паспрыяў эфектыўнаму існаванню Майстроўні на працягу некалькіх гадоў. Таксама важным чыннікам адносна спакойнага існавання ў першыя гады сваёй дзенйнасці была неакрэсліная пазыцыя ўлад да нефармальных недзяржаўных суполак. Гэта было новай, але хутка набіраючай папулярнасць, з'явай, таму камсамольскія ворганы імкнуліся напачатку падпрадкаваць дзейнасць такіх утварэнняў сваім мэтам, а не забараняць.

Суполка пачыналася з арганізацыіі так званых спевак. Удзельнікі збіраліся напачатку на філфаку БДУ (пасля "Майстроўня" здолела атрымаць месца ў палацы Прафсаюзаў), вывучалі і спявалі народныя песні. Кіраўніцай спевак была студэнтка кансерваторыі Ларыса Сімаковіч. Пасля, калі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Майстроўня” папоўнілася новымі ўдзельнікамі, пачаліся рэпетыцыі, а пасля і пастаноўка, народнай драмы “Цар Максіміліан”. Першы паказ спектаклю адбыўся ў Мінску, прысутнічалі некаторыя беларускія пісьменнікі, ў тым ліку Уладзімір Караткевіч. Майстроўцы актыўна займаліся рэканструкцыяй і арганізацыяй масавага святкавання беларускіх святаў: Гуканне Вясны ў Мінску і Заслаў’і, Купалле ў Вязанцы, Каляды і іншыя. Праводзіліся вечарыны паэзіі беларускіх паэтаў, гутаркі, лекцыі. “Майстроўня” ўсебакова падтрымлівала першы беларускамоўны рок-гурт “Мроя”. Менавіта пры падтрымцы “Майстроўні” гурт здолеў адыграць на Вялікдзень 1984 года канцэрт у Траецкім прадмесці, які стаў значнай падзеяй для станаўлення беларускай рок музыкі.

У 1983 годзе пры майстроўні было створана яе першае адгалінаванне – Таварыства беларускай школы. У межах дзейнасці гэтага таварыства майстроўцы збіралі подпісы за стварэнне школаў з выкладаннем на беларускай мове. Гэта быў ужо значны выклік дзяржаўнаму ладу, таму пачалася адчувацца пільная ўвага с боку улады. Але дзякуючы намаганням маладых людзей, было сабрана некалькі тысячаў подпісаў, ў прэсе пачалася дыскусія пра лёс роднай мовы, і ў выніку – у Мінску была адкрыта першая за шмат гадоў школа з беларускай мовай навучання.

“Кропкай невяртання” для існавання суполкі стаў першы для найноўшай гісторыіі Беларусі пікет. Майстроўцы выступілі супраць разбурэння дома Аўсея Поляка, што знаходзіўся ля кансерваторыі ў Мінску, дзе ў свой час адбылася пастаноўка “Сялянкі” Дуніна-Марцінкевіча. Пасля акцыі пачаўся пераслед удзельнікаў “Майстроўні” і суполка скончыла сваё існаванне. Але ёй на змену прыйшлі іншыя ўтварэнні, якія істотна паўплывалі на наступны лёс краіны. Гэта і Маладзёжны клуб імя У. Караткевіча, і  гісторыка-культурнае таварыства “Талака”, вядомае сваімі акцыямі. Нефармальныя суполкі ствараліся і ў іншых гарадах Беларусі: напрыклад гісторыка-культурны клуб “Паходня” ў Гродна, які займаўся вывучэннем і папулярызацыяй гісторыі Беларусі. Многія удзельнікі гэтых утварэнняў адыгралі важную ролю падчас атрымання краінай незалежнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Удзел ў "Майстроўні" (і ў іншых наступных нефармальных маладзёвых суполках) стаў шляхам для маладых беларусаў да сцвярджэння і захавання сваёй тоеснасці. Дзякуючы дзейнасці падобных суполак, адбывалася папулярызацыя традыцыйнай культуры і роднай мовы сярод шырокіх масаў. Удзельнікамі "Беларускай спеўна-драматычнай майстроўні" ў розныя часы былі намеснік старшыні Таварыства беларускай мовы Алена Анісім, культуролаг і мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі, мастак і літаратар Артур Клінаў. Такім чынам, дзейнасць і ўдзел ў нефармальных маладзёвых суполках за савецкім часам шмат ў чым сфарміравала сучаснае поле стварэння, распаўсюджвання і захавання нацыянальнай беларускай культуры.

---


1. Дубавец, С. І. Майстроўня. Гісторыя аднаго цуду / С. І. Дубавец. – Мн. : Радыё Свабода, 2012. – 457 с.
2. Ліндэр, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX-XX ст. / Р. Ліндэр. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2005. – 540 с.
3. Тарас, А. Е. Доля беларускае культуры пад Саветамі / А. Е. Тарас. – Мн. : Харвест, 2012. – 336 с.
4. Чернявская, Ю. В. Белорусы: от "тутэйших" к нации / Ю. В. Чернявская. – Мн. : ФАУинформ, 2010. – 510 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ